Чаус С.Э., студ. гр. 450 ФІДК
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Бамбешка І. І.
ст. выкладчык

## СТАНАЎЛЕННЕ, РАЗВІЦЦЁ І СУЧАСНЫ СТАН КАЛЕКЦЫЯНІРАВАННЯ МУЗЫЧНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ У БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калекцыянаванне музычных інструментаў у Беларусі прайшло шэраг этапаў. На нашу думку, можна вылучыць дамузейны перыяд збіральніцтва музычных інструментаў і перыяд непасрэдна музейнага калекцыянавання.

Да з’яўлення музейных устаноў у Беларусі асяродкам збірання музычных інструментаў станавіліся магнацкія і шляхецкія маёнткі. Наяўнасць музычных інструментаў у палацах і сядзібах была абумоўлена шэрагам прычын: па-першае, музычная адукацыя была абавязковай у шляхецкім асяроддзі; па-другое, у сядзібах ладзіліся музычныя салоны, падчас якіх майстэрства грання дэманстравалі гаспадары і госці; па-трэцяе, у палацах і сядзібах на ўтрыманні знаходзіліся капэлі прафесійных музыкантаў і г. д.

Музычныя інструменты, якія захоўваліся ў маёнтках, валодалі тымі ж уласцівасцямі і асаблівасцямі, якія былі характэрны для мастацкіх, гістарычных, натуральных і іншых калекцый этапу дамузейнага збіральніцтва. Склад калекцыі вызначаўся ў першую чаргу густам збіральніка. Музычныя інструменты далёка не заўсёды выкарыстоўваліся па прызначэнні. Часта інструменты набываліся па прычыне іх высокай мастацкай вартасці, незвычайнасці знешняга выгляду і г. д. Калі аналізаваць інвентары палацаў, можна заўважыць, што колькасць музычных інструментаў у шэрагу выпадкаў была значна вышэй за колькасць музыкантаў, якія знаходзіліся на ўтрыманні гаспадароў [10, с. 132].

Найбольш яскравым прыкладам калекцыянера музычных інструментаў XVIII ст. З’яўляецца гетман Міхал Казімір Агінскі. Ён стварыў так званую

“сядзібу музаў” у Слоніме, якая стала адным з найбольш значных і прагрэсіўных музычных асяродкаў тагачаснай Рэчы Паспалітай. Агульная колькасць музычных інструментаў, якія належалі гетману, складала, паводле інвентарных спісаў, больш за 100 адзінак. Аднак далёка не ўсе музычныя інструменты, якія належалі М. К. Агінскаму пры жыцці, патрапілі ў інвентарныя спісы, складзеныя пасля яго смерці па жаданні нашчадкаў.

Натуральна, што для захавання надзвычай вялікай колькасці музычных інструментаў, якія належалі слонімскай прыдворнай капэле, неабходны былі спецыяльныя пакоі. З гэтай мэтай у 1785 г. у адной з прыбудоў сядзібы было вылучана спецыяльнае памяшканне. Вядома, што з 1788 г. музычныя інструменты захоўваліся ўжо ў асобным будынку.

У адпаведнасці з асабістымі схільнасцямі М. К. Агінскага, калекцыя была асабліва багатай на смычковыя інструменты. Сустракаліся таксама і такія рэдкія экземпляры, як тэорба, горская валынка, якая служыла успамінам пра Шатландыю, шкляны гармонік, папулярны толькі ў вузкім коле аматараў музыкі. Гетман папаўняў сваю калекцыю ў час шматлікіх і частых падарожжаў. Менавіта такім чынам у Слоніме з'явіліся амстэрдамская віяланчэль даволі малавядомага майстра-інструменталіста Яна Лонге.

Такім чынам можна меркаваць, што музычныя інструменты выконвалі для гаспадара не толькі генетычную і ўтылітарна-спажывецкую функцыі, але і іншыя; і валодалі наступнымі ўласцівасцямі: інфарматыўнасці, экспрэсіўнасці, атрактыўнасці, рэпрэзентатыўнасці і асацыятыўнасці. На сённяшні дзень, паводле тэорыі музеязнаўства, менавіта гэтыя ўласцівасці вызначаюць музеальнасць прадметаў. Такім чынам, нашу думку, музычныя інструменты ў дадзеным выпадку з’яўляліся прадметамі музейнага значэння.

Значная колькасць музычных інструментаў існавала пры дварах Радзівілаў у Нясвіжы, Міхала Чартарыскага ў маёнтку Волчын пад Брэстам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аматарам музыкі і калекцыянерам музычных інструментаў быў князь Станіслаў Любамірскі, які набыў частку калекцыі М. К. Агінскага пасля яго смерці.

Другі этап калекцыянавання музычных інструментаў на Беларусі звязаны са з'яўленнем музеяў. Першыя мясцовыя музеі ствараліся пры навучальных установах, навуковых таварыствах [3].

Музычныя інструменты былі прадстаўлены ў зборах агульнадаступных музеяў гісторыка-краязнаўчага характару. Вядома, што калекцыямі музычных інструментаў валодалі Віленскі музей старажытнасцяў, Беларускі музей імя І. І. Луцкевіча ў Вільні. Гэтыя музеі былі заснаваныя на беларускай нацыянальнай ідэі. Гэтым тлумачыўся склад калекцый, дзе былі засяроджаны, у першую чаргу, мясцовыя старажытнасці, этнаграфічныя рэчы, творы беларускіх мастакоў і г. д. Сярод музычных інструментаў асноўнымі аб'ектамі калекцыянавання становяцца вырабы народных майстроў-музыкаў. Так, у Беларускім музеі імя І. І. Луцкевіча захоўваліся дуда, цымбалы, труба, жалейкі і інш. Значнасць музычных інструментаў тут падкрэслівалася тым, што яны былі вылучаны з прадметаў этнаграфіі ў асобную калекцыю [1, с. 105].

Некаторыя музычныя інструменты з Беларускага музея імя І. І. Луцкевіча пазней трапілі ў Беларускі дзяржаўны музей, які існаваў у Мінску ў міжваенны перыяд. Зараз яны з'яўляюцца часткай калекцыі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь [6, с. 3].

На сённяшні дзень музычныя інструменты захоўваюцца ў музеях літаратурнага, гістарычнага, мастацкага, комплекснага (краязнаўчыя) і іншых профіляў. У нашай краіне найбольш багатую калекцыю мае Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. У ёй прадстаўлены прафесійныя і народныя інструменты, маюцца надзвычай каштоўныя прадметы (скрыпкі Гальяна і Маджыні) [6, с.5].

Меншая па колькасці калекцыя музычных інструментаў сабрана ў Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусь – усяго 93 адзінкі захавання. Калекцыя пачала фарміравацца ў 1990 г., асноўная колькасць была сабрана за першыя пяць гадоў. У яе ўваходзяць прафесійныя і народныя інструменты. Аднак, паколькі музей не праводзіў экспедыцыі па рэгіёнах рэспублікі, аўтэнтычныя народныя інструменты тут прадстаўлены мала. У асноўным пераважаюць вырабы сучасных беларускіх майстроў-прафесіяналаў, а таксама маюцца ўзоры фабрычнай прадукцыі пачатку XX ст. [4, с. 42; 9].

У 1982 г. пры Мінскім інстытуце культуры (зараз – Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў) была створана майстэрня па вырабу беларускіх народных інструментаў, якую ўзначаліў заслужаны дзеяч мастацтваў У. Я. Пузыня. Пры майстэрні пачала дзейнічаць выстава, на якой прадстаўлены музычныя інструменты сучасных беларускіх майстроў [8, с. 101].

Паралельна з музейным існуе і прыватнае калекцыянаванне музычных інструментаў, якім займаюцца пераважна этнографы, інструментазнаўцы, музыканты. Гэтыя дзве сферы збіральніцтва цесна звязаныя паміж сабою – музеі набываюць прадметы ў прыватных асоб, часам, аматары перадаюць музеям цэлыя калекцыі. Так, калекцыя народных інструментаў Музея старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі была сабрана інструментазнаўцам І. Д. Назінай, а калекцыя Гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Заслаў'е” – кіраўніком фальклёрнага гурта “Ліцьвіны” У. Х. Берберавым [8, с. 103; 2].

Такім чынам, можна падвесці выснову, што калекцыянаванне музычных інструментаў у Беларусі з’явілася адначасова з калекцыянаваннем гістарычных, мастацкіх, натуральных прадметаў і таксама прайшло два этапы развіцця. Аднак на сённешні дзень музычнае калекцыянаванне як самастойная галіна музейнай справы ў нашай краіне слаба развіта і таму адчуваецца патрэба ў Рэспубліцы Беларусь музея адпаведнага профілю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Беларускі музей у Вільні // Музеі Беларусі: энцыкл. давед. – Мінск, 2008. – С. 105-106

2. Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе" прапануе выставу "Музыка вячорак" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.tvr.by/bel/culture.asp?id=9362. – Дата доступу: 26.07.2009

3. Гужалоўскі, А. А. Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2001. – 124 с.

4. Лабовіч, А. Першая экспазіцыя Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры /А. Лабовіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 3. – С. 41

5. Музеи музыкальные // Музыкальная энциклопедия [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу: http://muzipedia.ru/111. – Дата доступу: 26.07.2009.

6. Музычныя інструменты: Струнныя: музейны каталог / Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі; [Г. М. Загурская]. – Мінск: Выдавец В. П. Анікеенка, 2000. – 15 с.

7. Музыкальные музеи // Российская музейная энциклопедия [Электронный ресурс]. – 2002. – Рэжым доступу: http://www.museum.ru/rme/sci_music.asp. – Дата доступу: 15.08.2009.

8. Скорабагатчанка, А. В. Беларускія народныя музычныя інструменты XX стагоддзя / А. В. Скорабагатчанка. – Мінск: Бел. навука, 2001. – 397 с.

9. Спіс калекцыі музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры // Бягучы архіў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры.

10. Цеханавецкі, А. Міхаіл Казімір Агінскі і яго "сядзіба музаў" у Слоніме / Анджэй Цеханавецкі; [пераклад з нямецкай мовы У. Сакалоўскага; навуковы рэдактар перакладу і аўтар прадмовы А. Мальдзіс]. – Мінск : Про Хрысто, 2006. – 269 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ